1. **Фралоў, П.** На пярэднім краі / П. Фралоў // Герой працы (Шуміліна). – 1977. – 27 студз.

НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

Аляксей Зуеў нарадзіўся ў вёсцы Фёдараўская Смаленскай вобласці. Працаваў некаторы час фінансавым агентам. Але юнака вельмі цягнула да тэхнікі. Неўзабаве мара здзейснілася: набыў спецыяльнасць трактарыста. Думаў вучыцца і далей, ды ў жыццёвыя планы людзей умяшалася вайна.

У дзевятнаццаць год надзеў Аляксей салдацкі шынель. Са зброяй у руках абараняў Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Камсамольцы стралковага батальёна абралі Зуева сваім важаком. На фронце юнак атрымаў афіцэрскае званне, уступіў у рады ленінскай партыі.

Гвардыі лейтэнант Зуеў не любіў гучных фраз. Асабістым прыкладам натхняў ён байцоў свайго падраздзялення на баявыя подзвігі. Воіны батальёна прывыклі бачыць свайго камсамольскага важака заўсёды наперадзе, там, дзе рашаўся зыход бою. Нават у самай складанай сітуацыі храбрага афіцэра не пакідала воінская вытрымка, уменне хутка знайсці выйсце з крытычнага становіпіча.

Асабліва вызначыўся Аляксей Зуеў пры вызваленні чыгуначнай станцыі Обаль. Было гэта 26 чэрвеня 1944 года. Гітлераўцы, знаходзячыся ў абароне, узвялі дзесяткі розных умацаванняў. Асабліва вакол станцыі Обаль, якая раней не раз падвяргалася атакам партызан. Камандаванне стралковага батальёна атрымала загад вызваліць Обаль. Падраздзяленне падтрымлівалі агнём артылерысты і мінамётчыкі. Група воінаў на чале са сваім камсоргам адной з першых уварвалася ў варожыя траншэі. Лейтэнант Зуеў у гэтым баі асабіста знішчыў пятнаццаць нямецкіх салдат і двух афіцэраў. Аперацыя, здавалася, праходзіла паспяхова, без істотных страт. Але вось па наступаючых ударыў варожы кулямёт. Часу для доўгага роздуму не было. Афіцэр па траншэі неўпрыкмет падабраўся да агнявой кропкі праціўніка. Кінуў адну гранату, потым другую. Кулямёт змоўк. Але радавацца было яшчэ рана. Па воінах стралковага батальёна біў варожы мінамёт. Ён сур'ёзна перашкаджаў далейшаму наступленню. На рызыкоўную аперацыю па знішчэнню разліку мінамёта зноў накіраваўся Аляксей Зуеў. Абыйшоў праціўніка з тылу. Больш за ўсё баяўся, каб не трапіць на міну, якіх на пярэднім краі быгло ўстаноўлена вялікае мноства. Аднак удача і тут спадарожнічала адважнаму афіцэру. Супрацьтанкавай гранатай ён знішчыў варожы мінамёт і яго разлік.

За подзвігі пры вызваленні зямлі шумілінскай гвардыі лейтэнанту Аляксею Міхайлавічу Зуеву было прысвоена высокае званне Героя Савецкагг Саюза.

П. Фралоў